# У Гродзенскай ВДС распачаўся новы навучальны год

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
10.10.2021 00:00



Апостальскі нунцый абп Антэ Ёзіч да семінарыстаў: “Няхай малітва стане для вас нагодай да асабістай сустрэчы з Богам”. Ва ўрачыстай інаўгурацыі, якая ўжо ў 32-гі раз адбылася ў гродзенскай семінарыі, прынялі ўдзел Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп намінат Юзаф Станеўскі, біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч, выкладчыкі і выхаваўцы, духавенства, манаскія сёстры, свецкія супрацоўнікі семінарыі, бацькі і блізкія семінарыстаў. † З дакладам на тэму “Новыя сродкі камунікацыі: небяспека ці магчымасці для новай евангелізацыі?” выступіў выкладчык пастаральнай тэалогіі і сродкаў сацыяльнай камунікацыі кс. доктар Юрый Жэгарын.

Цырымонія адкрыцця навучальнага года завяршылася ўручэннем заліковак алюмнам першага курса, якіх сёлета сямёра, а кульмінацыяй стала св. Імша ў касцёле Адшукання Святога Крыжа (пабернардынскі), цэлебрацыю якой узначаліў Апостальскі нунцый у Беларусі арцыбіскуп Антэ Ёзіч.

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
10.10.2021 00:00

